# Няхай жыве Вялікі Кастрычнік!

**Ідзём мы вернаю дарогай,**
**Ірдзяцца зоры нашых дзён,**
**Бо нам прастору, волі многа,**
**І ўсё шырэе даль—разлога,**
**І ўсё дужэе наш разгон.**

*Якуб Колас*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 32 (502) | Нядзеля, 4 лістапада 1962 г. | Цана 1 кап.


## УСЁ БЛІЖЭЙ СВЯТА!

Гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі — найвялікшае свята савецкага народа і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Яго заўсёды чакаюць, як чакаюць самы лепшы ў жыцці дзень. І ў гэтым годзе працоўныя ўсёй краіны Саветаў адразу ж пасля гераічных подзвігаў у імя пралетарскага свята 1 Мая, пачалі рыхтаваць працоўныя падарункі Вялікаму Кастрычніку. На кожным участку камуністычнага будаўніцтва пануе працоўны і палітычны ўздым. І хоць свята прыдзе яшчэ толькі праз 3 дні, мільёны савецкіх рабочых і сялян, савецкіх працоўных ужо маюць поўнае права святкаваць перамогу: тое, што яны абавязваліся зрабіць да свята, ужо зроблена, выканана і перавыканана.

Падрыхтаваў падарункі светламу святу і калектыў нашага універсітэта. Веды, выдатныя веды савецкага студэнта, будучага маладога спецыяліста— вось сапраўдны падарунак Кастрычніку!

Ідзе Кастрычнік! Гэта ён адкрыў нам шлях да камунізма, гэта пад яго сцягам мы крочым да светлага будучага — мары ўсяго чалавецтва!

Малюнак М. Знака.




## Камсамольцы—аб камсамоле

На адным з пасяджэнняў члены камсамольскага бюро адміністратыўна-гаспадарчай часткі абмяркоўвалі пытанне, як лепш правесці вечар, прысвечаны Дню нараджэння камсамола. Тады ж рашылі даручыць афармленне стэнда аб камсамоле бухгалтару Ларысе Аверчанкавай і старшаму тэхніку Уладзіміру Вішнеўскаму. Астатнія камсамольцы таксама актыўна ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы вечара. Перад пачаткам вечара сабраўшыяся камсамольцы сабраліся ля стэнда, успомнілі баявыя справы камсамола ваенных і мірных часоў.

З дакладам аб слаўным шляху камсамола выступіла бібліятэкар Ніна Міцкевіч. Пасля гэтага камсамольцы бібліятэкар Святлана Мысько і Ларыса Аверчанкава расказалі аб барацьбе беларускіх камсамольцаў супраць нямецка- фашысцкіх захопнікаў (па кнізе Ольгі Сіманавай «Мы будзем жыць», дзе дзейнічаючыя асобы — камсамольцы Астрашыцкага Гарадка). На жаль, з-за хваробы не змагла прысутнічаць на вечары выкладчыца філфака Ларыса Лявонцьеўна Кароткая, адна з гераінь гэтай кнігі.



На вечары выступіў запрошаны да камсамольцаў дацэнт фізічнага факультэта, былы сакратар падпольнай камсамольскай арганізацыі ў пасёлку Талька Пухавіцкага раёна Іван Іванавіч Пятроўскі. Ён падзяліўся сваімі ўспамінамі аб баявых справах камсамольцаў у час Вялікай Айчыннай вайны, расказаў цікавыя эпізоды з дзейнасці арганізацыі і асобных камсамольцаў.

В. ЛУСКІНА.

### САКРАТАРЫ
### КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ФАКУЛЬТЭТАЎ, АБРАНЫЯ НА СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧЫХ СХОДАХ

22—25 кастрычніка 1962 года

Біялагічны факультэт — Ніла **Дароніна** (4 курс).
Геаграфічны факультэт — Ольга **Лампе** (3 курс).
Гістарычны факультэт — Уладзімір **Гілеп** (3 курс).
Матэматычны факультэт — Барыс **Яшчын** (4 курс).
Фізічны факультэт — Васілій **Стражаў** (2 курс).
Філалагічны факультэт—Яўгеній **Сяліцкі** (3 курс).
Хімічны факультэт — Ігар **Дзярбінскі** (4 курс).
Юрыдычны факультэт — Яўгеній **Кавалёў** (3 курс).

## Універсітэт за тыдзень

* * *

*Адбыўся вечар савецка-галандскай дружбы, прысвечаны 15-годдзю Таварыства «Нідэрланды—СССР». Вечар быў арганізаваны Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі і кафедрай геаграфіі замежных краін БДУ імя У. І. Леніна.*

* * *

*Арганізаваны цыкл канцэртаў Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Беларускай ССР «Выбраныя сімфанічныя творы П. І. Чайкоўскага і савецкіх кампазітараў». У праграме першага канцэрта, які адбыўся 31 кастрычніка, — Першая сімфонія «Зимние грёзы» і Варыяцыі на тэму «рококо» Пятра Ільіча Чайкоўскага і Сімфонія № 1 Д. Смольскага.*

* * *

*Ва універсітэце адбыўся вечар, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння Самуіла Якаўлевіча Маршака.*

## У гонар Дня савецкай міліцыі

Працоўныя нашай краіны 10 лістапада упершыню будуць святкаваць Дзень савецкай міліцыі. Яна была створана па ініцыятыве У. І. Леніна як орган аховы рэвалюцыйнага парадку. У гэтым годзе савецкая міліцыя адзначае сваё 45-годдзе.

У Мінску вядзецца падрыхтоўка да Дня савецкай міліцыі. На прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах чытаюцца даклады. На станкабудаўнічым заводзе імя Кірава з дакладам выступіў начальнік Упраўлення міліцыі Міністэрства аховы грамадскага парадку БССР В. І. Жукаў. На радыёзаводзе даклад зрабіў намеснік начальніка школы міліцыі Г. С. Сідараў.

Даклады, прысвечаныя Дню савецкай міліцыі, адбыліся таксама на тонкасуконным камбінаце, у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, педагагічным інстытуце, інстытуце народнай гаспадаркі і ў іншых месцах.

(БЕЛТА).

**Творчасці Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі, выпаў лёс шчаслівы і рэ кі—яна даўно перастала належаць адной рэспубліцы і зрабілася здабыткам усяг савецкага народа.**

(Мікалай Грыбачоў

# ЮБІЛЕЙ ПЕСНЯРА

Уся Беларусь адзначае сёння 80-годдзе з дня нараджэння беларускага народнага паэта Якуба Коласа, які прысвяціў усю сваю творчасць, аддаў усе свае сілы, увесь творчы розум роднаму народу, сваёй краіне.

Колас адным з першых стварыў вобразы беларускіх сялян, жыва намаляваў іх быт, мары, думкі.

Свае першыя вершы Кастусь Міцкевіч пачаў пісаць яшчэ ў раннім дзяцінстве, але пачаткам літаратурнай дзейнасці лічыцца 1906 год, калі ў беларускай газеце «Наша доля» быў надрукаваны верш «Наш родны край», пад якім стаяў подпіс— Якуб Колас. З тых часоў пачынаецца творчае літаратурнае жыццё Якуба Коласа, які лічыў літаратуру сілай, здольнай усхваляваць народныя масы, узняць людзей працы на барацьбу з прыгнётам. У дарэвалюцыйны перыяд асноўнай тэмай твораў Коласа з'яўляецца паказ горкага жыцця беларускага народа. А як самабытна, ярка малюе ён вобразы сялян, дзяцей! Але Якуб Колас не толькі адлюстроўвае цяжкую сапраўднасць. Ён верыць у светлае будучае свайго народа, услаўляе яго свабодалюбства, непакорнасць.

Цяжкім было жыццё паэта ў дарэвалюцыйны час. За ўдзел у з'ездзе настаўнікаў яго кінулі ў турму. Але і тут Колас не паддаўся — ён працягваў сваю літаратурную дзейнасць. Неўзабаве пасля вызвалення Якуб Колас пачаў свае лепшыя паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка», якія былі закончаны пасля рэвалюцыі.

У савецкі час літаратурная дзейнасць Якуба Коласа цесна пераплятаецца з грамадзянскай. Ён працуе ў Беларускім педагагічным тэхнікуме, у Беларускім універсітэце, удзельнічае ў арганізацыі Акадэміі навук БССР, выдае першы падручнік беларускай мовы, шмат працуе над стварэннем новых твораў. Піша трылогію «На ростанях», выпускае зборнікі «Адпомсцім», «Голас зямлі».

У пасляваенныя гады Якуб Колас узбагачае беларускую літаратуру новым выдатным творам «Рыбакова хата». І ва ўсёй творчасці, пачынаючы з далёкіх часоў пачатку літаратурнай дзейнасці і канчаючы апошнімі творамі, чырвонай лініяй праходзіць любоў Якуба Коласа да народа, да роднай беларускай прыроды. І народ адказвае яму ўзаемнасцю. Людзі ўсіх пакаленняў памятаюць, ведаюць, любяць творы Якуба Коласа. Яго імем названы вуліцы і плошчы ў сталіцы Беларусі і іншых гарадах, тэатр у Віцебску, паліграфічны камбінат у Мінску. Яго імя жыве ў сэрцы кожнага беларуса, кожнага, хто хоць раз меў шчасце чытаць яго творы.

Б. ФАМІН.

## СЛОВЫ СЭРЦА

**«У Беларусі ёсць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала, вельмі цікавыя рабяты. Проста пішуць, так сардэчна, сумна, шчыра. Нашым бы крыху такіх якасцей... Вось бы добра было...»** (Максім Горкі. Пісьмо да М. Кацюбінскага ад 24 лістапада 1910 года).

* * *

**«Вялікі і слаўны жыццёвы і творчы шлях прайшоў народны паэт Беларусі Якуб Колас. І на працягу ўсёй гэтай цяжкай дарогі паэт заставаўся верным ідэалам самаадданага служэння Радзіме і народу».** (Пятро Глебка. Народны паэт Беларусі).

* * *

**«Я не многа разоў сустракаўся з Якубам Коласам, і кожная сустрэча з ім пакідала такое ўражанне, якое пакідае ў памяці пах чыстай лясной кветкі, знойдзенай ранняй вясной на паляне, дзе пяшчотна зелянее трава. Уражанне чысціні і свежасці».** (Максім Рыльскі. Пра паэта і друга).

* * *

**«Вялікі сын свайго народа, класік яго літаратуры, майстар яго роднай мовы, Колас належыць да ліку людзей, жыццёвая праца якіх абвяшчала новыя, лепшыя часы для свайго і для іншых братніх народаў. Гэта забяспечыла вялікую трываласць яго творчасці».** (Леон Кручкоўскі. Шчыры сябра).

* * *

**«...Паэзія Коласа становіцца здабыткам усёй Азіі. Якуб Колас быў сівым арлом беларускай паэзіі, а арлы жывуць доўга».** (Б. Явуухулан. Арлы жывуць доўга).

# ДЗЕ ЎЗНЯЎСЯ БУЙНЫ КОЛАС

Гэтым летам студэнт 5 курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры **Вячаслаў РАГОЙША** разам са сваімі сябрамі-аднакурснікамі пабываў у турысцкім паходзе па коласаўскіх мясцінах.

Сёння мы прапануем вашай увазе яго вершы, якія напісаны пасля незабыўных сустрэч з наднёманскай зямлёй.

### НАКАЗ ЦЯГНІКУ

*Цягнік, наказ наш улічы:*
*званчэй па рэйках лязгай,*
*хутчэй да Стоўбцаў даімчы —*
*зрабі такую ласку.*
*Мы зноў студэнцкаю раднёй*
*спяшаемся, дзе калісь*
*над пульхнай, шчодраю раллёй*
*узняўся буйны колас.*
*Нам зерні з коласа таго,*
*як іскры, ў сэрцы ўпалі*
*і там, збудзіўшыя агонь,*
*навечна запалалі.*
*Хай будзе слота, хай імжа*
*ў жыццёвае праверцы,*
*але агонь той*
*і дажджам*
*не вымыць з нашых сэрцаў;*
*палаць яму там з году ў год.*
*Нам шчасце ж адгукнецца,*
*калі другім каля яго*
*захочацца пагрэцца.*

### У АЛЬБУЦІ

*Спяць хлопцы ў палатках белых,*
*спяць, покуль сны не збеглі.*
*А я*
*грыбніком*
*на золку*
*іду і ад сноў, і ад дому.*
*Кашлатую лапу елкі*
*трасу, як стары знаёмы, —*
*я з борам жыву па-просту.*
*Глытаю дзяцінства водар.*
*Нібыта альбуцкі Костусь,*
*праходжу ў хорам прыроды.*
*У хораме ўлада цішы.*
*Сасна сон у шапцы калыша.*
*Спяць птушкі на лапах ялінаў.*
*Спяць краскі ў абдымках травінак.*
*Ці ў гэткае шчасце паверыш?!*
*Рукам далікатнасць раю.*
*Там неруш?*
*Няхай расце неруш —*
*сны-мары я сёння збіраю.*
*Сасна аддае свае мроі,*
*і птушкі—сноў светлыя кроі,*
*і краскі мне радасць трояць.*
*Зара прашугала паверку*
*і краскам,*
*і птушкам,*
*і соснам.*
*Я з кошыкам, поўным даверху,*
*дадому йду сцежкаю роснай.*
*Свой скарб тут сябрам паказваю*
*Дзівуюць,*
*вачам не верачы:*
*у кошыку*
*дзіўнай казкай*
*ляжаць маладыя вершы.*

### СУСТРЭЧА

*Дзе Вы, дзядзька Якуб?*
*Я прыехаў, каб з Вамі сустрэцца.*
*Мне сказалі ў Ластку,*
*што пайшлі яшчэ з ранку ў грыбы.*
*Ціхі смутак кляноў,*
*як далонь, на плячо мне кладзецца*
*і ў шлях блаславіяе,*
*і тут жа ўсцяшае нібы.*
*Перастукі дзятлоў —*
*перамовы лясных інжынераў...*
*Стой, імгненне!*
*Між соснаў*
*у простым сівым кажушку —*
*ён, ён, дзядзька Якуб!*
*Рэжа грыб.*
*Можа, трапіў на неруш?*
*Зноў нагнуўся.*
*А я?..*
*Хіба ж льга замінаць грыбніку?!*

*Дзе Вы, дзядзька Якуб?*
*Я хачу-такі з Вамі сустрэцца.*
*Мне сказалі ў Альбуці,*
*што, вуды узяўшы, пайшлі...*
*Зноў, фарбуючы воды,*
*зара ў Нёман льецца і льецца*
*дзесь у далечы дальняй,*
*на самым акраі зямлі.*
*Бераг стромы.*
*Віры.*
*Шчупакі асцярожныя водзяць...*
*Божа! вунь і яны!*
*пэўна, побач няўрымсны Антось...*
*Толькі ж лепш пачакаю,*
*не буду цяпер падыходзіць:*
*можа рыбу спалохаць*
*нягаданы гэтакі госць.*

*Дзе Вы, дзядзька Якуб?*
*Я змагу, ўрэшце, з Вамі сустрэцца:*
*Мне сказалі у Смольні,*
*што косіце Вы паплавы...*
*Знічка долу спадзе*
*і ў сотнях расінак мільгнецца,*
*і сама расцярушыцца*
*ў шчэцці калючым травы.*
*Сёння раніца росная.*
*Косы ўсё прагнуць атавы.*
*Трэці раз Вас пазнаў!*
*Не ўзнімайце сабе галавы —*
*я пазнаў Вас па росце,*
*плячах,*
*па ўзмахах рухавых...*
*Ды аклікваць не стану:*
*а што, калі гэта не Вы?!*

# Пабольш такіх семінараў

Вучоба! Колькі настойлівасці і ўпартасці яна патрабуе ад студэнтаў, колькі ўмення перадаваць багатыя веды будучым спецыялістам патрабуе ад прафесарска-выкладчыцкага калектыву! У гэтай сувязі нам успамінаюцца спецыяльныя семінары, якія ў мінулым навучальным годзе былі арганізаваны дацэнтам кафедры гісторыі КПСС Сямёнам Мікалаевічам Сцёпіным па тэме «Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза супраць гітлераўскай Германіі». Яны праходзілі выключна цікава. Сямён Мікалаевіч распрацаваў тэму кожнага заняткy. Адны студэнты рыхтавалі даклады, другія чыталі ўспаміны і мемуары славутых ваенных дзеячоў. Таму семінары ператвараліся ў жывыя і зямястоўныя дыскусіі, у ходзе якіх кожны студэнт у творчай абстаноўцы ўзбагачаўся ведамі аб гераізме савецкіх людзей у тыя гады, калі на савецкую зямлю рынулася карычневая фашысцкая чума.

Семінары былі тым больш цікавымі, што выкладчык Сямён Мікалаевіч Сцёпін, як удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, абагульняючы выступленні студэнтаў, гаварыў аб сваіх уражаннях, расказваў аб героях вайны і іх подзвігах.

Наш выкладчык не толькі перажыў вайну, але і прачытаў аб ёй шмат замежнай літаратуры. Аналізуючы творы замежных аўтараў, Сямён Мікалаевіч вучыў нас крытычна падыходзіць да іх ацэнкі падзей мінулай вайны, звязваць гераічную барацьбу савецкіх людзей у тыя грозныя гады з сённяшняй барацьбой за мір.

Пабольш бы такіх семінараў!

Ларыса ІВАНОВА,
Віктар БРАЗОЎСКІ,
студэнты 4 курса гістарычнага факультэта.

*Шашкі*

# ПЕРАМАГЛІ МАТЭМАТЫКІ

Амаль месяц працягвалася асабіста-каманднае першынство універсітэта па рускіх шашках сярод першакурснікаў. Набраўшы 22 ачкі, першае месца і званне чэмпіёна заваявала каманда матэматычнага факультэта, у складзе якой ігралі: Мукасей, Кот, Вап, Заблоцкі, Позняк. Склад каманды быў вельмі роўны. Гэта і забяспечыла поспех. На 4 ачкі адстала ад пераможцаў каманда геаграфічнага факультэта, якую ўзначальваў кандыдат у майстры Каган. На трэцім месцы — гісторыкі. Далей ідуць хімікі, фізікі, біёлагі. Каманда фізічнага факультэта магла б прэтэндаваць на перамогу, але з-за неарганізаванасці, няяўкі асобных членаў каманды аказалася на 5 месцы.

У асабістым заліку чэмпіёнам першых курсаў стаў першаразраднік А. Чэхаўской (фізфак), сярод жанчын перамагла В. Позняк (матфак).

Спаборніцтвы праходзілі ў вострай барацьбе і выявілі шмат здольных шашыстаў. Гэта — Кот, Мукасей (матфак), Ляўчук (біяфак), Лахвіч, Філіповіч (хімфак), Няхай (гістфак), Сягло (фізфак) і многія іншыя. Асабліва трэба адзначыць поспех студэнткі матфака В. Позняк. На сваёй дошцы яна выйграла ўсе партыі. Цяпер яна ўдзельнічае ў мужчынскім турніры 3 разрада, дзе пасля пяці тураў ужо мела 4 ачкі. Выдатны старт! Хочацца пажадаць ёй далейшых поспехаў.

Г. ДРАБУШЭВІЧ,
галоўны суддзя спаборніцтваў.

## З ЗАМЕЖНАГА ГУМАРУ

●

*— Чаму адзін бок твайго аўто пафарбаваны ў блакітны колер, а другі — у чырвоны?*

*— Я імкнуся ўсё прадбачыць. На судзе сведкі супярэчуць адзін аднаму.*

●

*Прафесар: Што такое сінонім?*

*Студэнт: Сінонім — гэта слова, якое ўжываецца замест іншага, калі мы не ведаем правапісу першага.*

●

*— Ого, у Вас тры пары акуляраў?*

*— Так, сэр. Адна, каб глядзець удалечыню, другая — каб чытаць, а трэцяя — каб шукаць першыя дзве пары.*

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэлефон 2-07-19. Друкарня Белсаўпрофа. АТ 15671 Зак. 3194